Грамадскае аб' яднанне
«БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
220030 г. Мінск, вул. Кальварыйская, 16-265,
тэл./факс (+375 17) 317-56-85
E-mail: baj@baj.by, http://www.baj.by

Общественное объединение
«БЕЛОРУССКАЯ АССОЦИАЦИЯ ЖУРНАЛИСТОВ»
220030 г. Минск, ул. Кальварийская, 16-265
тел./факс (+375 17) 317-56-85
E-mail: baj@baj.by, http://www.baj.by

7.02.2018 г. № 3

**Міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь**
**Карлюкевічу Аляксандру Мікалаевічу,**
**220004, пр. Пераможцаў, 11, г. Мінск**

Паважаны Аляксандр Мікалаевіч!

На выніковай калегіі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за 2017 г., якая адбылася 5 лютага 2018 г., было агучана, што створана міжведамасная група па выпрацоўцы зменаў у Закон “Аб сродках масавай інфармацыі”, а таксама звязаных з гэтым дапаўненняў і змяненняў у Падатковы кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях.

ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” больш за 10 год вядзе маніторынг сітуацыі ў СМІ і практыку прымянення заканадаўства аб СМІ ў Беларусі. Нашы эксперты супрацоўнічаюць з міжнароднымі арганізацыямі і ўстановамі па пытаннях паляпшэння сітуацыі са свабодай прэсы. Мы гатовы падзяліцца вопытам і вынікам сваёй працы з міжведамаснай групай і Міністэрствам інфармацыі РБ.

У звязку з вышэй узгаданым просім:

1. Уключыць прадстаўніка ГА “БАЖ” у склад міжведамаснай рабочай групы па падрыхтоўцы змяненняў у закон “Аб сродках масавай інфармацыі”;

2. Прадаставіць ГА “БАЖ” праект змяненняў у закон “Аб сродках масавай інфармацыі”.

У адпаведнасці з Палажэннем аб Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь № 1545, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 26.10.2001 г., Міністэрства інфармацыі ў межах сваёй кампетэнцыі распрацоўвае праекты законаў Рэспублікі Беларусь, рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь; супрацоўнічае з грамадскімі аб'яднаннямі і іншымі арганізацыямі па пытаннях, звязаных з

распаўсюдам масавай інфармацыі, ажыццяўленнем выдавецкай, паліграфічнай дзейнасці, дзейнасці па распаўсюдзе друкаваных выданняў і прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі.

Міжведамасны план па рэалізацыі рэкамендацый, прынятых Рэспублікай Беларусь па выніках праходжання другога цыклу ўніверсальнага перыядычнага агляду ў Савеце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, і рэкамендацый, адрасаваных Рэспубліцы Беларусь дагаворнымі органамі па правах чалавека, на 2016 - 2019 гады накіраваны, сярод іншага, на выкананне рэкамендацый адносна свабоды выказвання меркавання і свабоды прэсы. Дзеля гэтага ім, у прыватнасці, прадугледжваецца:

- выяўленне праблем у галіне правоў чалавека і распрацоўка магчымых заканадаўчых і інстытуцыйных мер па іх вырашэнні;
- пашырэнне дзяржаўна-грамадскага партнёрства ў галіне правоў чалавека;
- удасканаленне практыкі збору і аналізу дэталізаваных дадзеных па ўсіх аспектах правоў і свабод чалавека з выкарыстаннем паказчыкаў, якія адлюстроўваюць ажыццяўленне міжнародных стандартаў у галіне правоў і свабод чалавека ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі.

Мерапрыемствы вышэй згаданага Міжведамаснага плана павінны ажыццяўляцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання з прыцягненнем навуковых, рэлігійных арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў.

10 кастрычніка 2017 г. Грамадскае аб'яднанне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" ужо звярталася да Вас са зваротам аб сумесным абмеркаванні актуальных праблем, датычных сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку мадэрнізацыі заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі. На жаль, адказ на яго мы не атрымалі да гэтага часу.

Спадзяёмся на больш канструктыўныя далейшыя адносіны. Відавочна, што мы можам быць больш ўзаемакарыснымі.

**Намесніца старшыні**
**ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"** **А. В. Суравец**

Дадатак: копия зварота ГА "БАЖ" ад 10.10.2017, вых. № 52.